ЗА МІР, КАМУНІЗМ, ШЧАСЦЕ!

На здымках: (уверсе)упершыню галасуе студэнт юрфака Валянцін Елісеенка,(унізе) атрымліваюць выбарчыя бюлетэні студэнткі філфака.

Фота М. Нечыпарэнкі.

А шостай гадзіне раніцы, раней, чым звычайна, засвяціліся вокны студэнцкага інтэрната № 4, што па Паркавай магістралі. Дзень выбараў. І студэнцтва імкнецца выканаць свой грамадзянскі абавязак у ліку першых.

Будынак сярэдняй школы № 44 г. Мінска. Тут размясціліся выбарчыя ўчасткі № 22 і № 23 па выбарах у Фрунзенскі раённы і ў гарадскі Саветы дэпутатаў працоўных. Памяшканне ў святочным убранні. Апрача выбарчай камісіі, задоўга да пачатку галасавання сюды прыйшлі школьнікі.

Шэсць гадзін. Першыя выбаршчыкі. Дзяўчынка-вучаніца сустракае пытаннем:

— Вы на якой вуліцы пражываеце?

— Паркавая магістраль, — адказвае Валянцін Елісеенка, студэнт першага курса юрфака.

— Вам трэба падняцца на другі паверх, — падказвае яна.

Валянцін упершыню ўдзельнічае ў выбарах. І таму бярэ бюлетэні з хваляваннем. На іх прозвішчы кандыдата ў раённы Савет Зінаіды Сцяпанаўны Курбыка ад калектыву супрацоўнікаў 2-й клінічнай бальніцы, кандыдата ў гарсавет Станіслава Міхайлавіча Лукашэвіча ад калектыву рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых будаўнічага трэста № 4.

Адразу ж за Валянцінам да ўрны падыходзіць студэнтка філфака Соф'я Саламевіч. У гэты час наш фотакарэспандэнт М. Нечыпарэнка асвечвае іх твары ўспышкамі магніевай лямпы. Маю ўвагу прыцягнуў пажылы чалавек, які галасаваў разам са студэнтамі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Віталій Рыгоравіч Карповіч прыпамінае, як праходзілі першыя выбары.

— Мне прыходзілася назіраць, — расказвае ён, — як наш народ упершыню удзельнічаў у выбарах. Было гэта ў 1937 годзе. Па ўзросту ўдзел у выбарах я яшчэ не прымаў, але быў на выбарчым участку, які знаходзіўся ў суседняй вёсцы. Са сваімі сябрамі-камсамольцамі мы наладзілі там дзяжурства. Хацелася першымі прыйсці туды. Спяшаліся. І на ўчастак прыйшлі задоўга да пачатку, але там ужо былі многія. Першымі галасавалі самыя паважаныя старажылы.

Некаторыя сяляне, пераступаючы парог выбарчага ўчастка, здымалі шапкі, кланяліся. Іх не цяжка было зразумець. За ўсё немалое жыццё яны ўпершыню галасавалі за народную ўладу. Гэта сапраўды было для іх святым.

І вось цяпер, праз 32 гады, я зноў задоўга да пачатку галасавання на выбарчым участку № 23. Змены, што адбыліся за гэты час, гавораць самі за сябе. У тыя часы нам прыходзілася ісці пешшу да выбарчага ўчастка больш трох кіламетраў. Цяпер жа сучасны транспарт скарачае адлегласць. Для людзей, якія не могуць па той ці іншай прычыне прыйсці на выбарчы ўчастак, арганізаваны перасоўныя ўрны.

Да членаў выбарчай камісіі падыходзіць яшчэ група моладзі. Гэта студэнты факультэта журналістыкі. Сярод іх Васіль Гурын, які на працягу трох год вучыцца толькі на выдатна, актывісты Ігар Асінскі, Валерый Рыдкі. Апускаючы бюлетэні, яны гавораць:

— Галасуючы сёння за кандыдатаў блока камуністаў і беспартыйных, мы галасуем за самыя дэмакратычныя правы на творчы пошук, права гаварыць з высокай аўтарытэтнай трыбуны нашага друку. І мы зноў задумваемся над тым, якую адказнасць нясем перад астатнімі выбаршчыкамі, перад усім народам.

У. ШАРПІЛА,

ПРЭЧ РУКІ АД САВЕЦКАЙ ЗЯМЛІ!

Калектыў універсітэта гнеўна асуджае правакацыі кітайскіх авантурыстаў

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 10 (739) ● Пятніца, 21 сакавіка 1969 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXII

ГАНЬБА РАСКОЛЬНІКАМ!

Мяне, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, да глыбіні душы абурыла ганебная правакацыя кітайскіх улад на савецка-кітайскай граніцы. Правакатары ў Пекіне страцілі галовы. Імкнучыся адцягнуць увагу свайго народа ад тых цяжкасцей, якія сталі вынікам авантурыстычнай палітыкі, група Мао Цзэ-дуна пайшла на нахабнае ўзброенае ўварванне ў межы нашай Радзімы. У выніку гэтай правакацыі пралілася кроў савецкіх людзей. Абвастрэнне абстаноўкі на савецка-кітайскай граніцы сведчыць аб тым, што маоісты працягваюць ісці па авантурыстычнаму шляху.

Працоўныя нашай краіны рашуча пратэстуюць супраць узброеных правакацый, горача падтрымліваюць знешнюю палітыку Савецкага ўрада—палітыку міру і дружбы паміж народамі. Яны не дазволяць кітайскім шавіністам ажыццявіць свае намеры. Дастойны адпор правакатарам нашых пагранічнікаў сведчыць аб тым, што яны прадаўжаюць баявыя традыцыі сваіх бацькоў і братоў. Правільна сцвярджаецца ў народнай прымаўцы: хто да нас прыйдзе з мячом, ад мяча і загіне.

М. ЗАЙЦАЎ,
выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі, Герой Савецкага Саюза.

ГНЕЎ І АБУРЭННЕ!

Сэрца кожнага савецкага чалавека напоўнена пачуццём болю, гневу і абурэння ў сувязі з ганебнымі правакацыямі зграі Мао на савецка-кітайскай граніцы. Але, акрамя гэтых пачуццяў, узнікае непаразуменне — як маглі справацыраваць пэўную частку кітайскага народа на падобныя крывавыя злачынствы? Доўгія ж гады сардэчнымі і непарушнымі былі нашы сяброўскія сувязі і вялікая дапамога Кітаю.

Мне ўспамінаюцца сустрэчы з рабочымі Цяньцьзіня і Шанхая, калі самымі зразумелымі былі словы «дружба», «хепін» (мір). Амаль усе цэхі станкабудаўнічага завода горада Шанхая былі абсталяваны станкамі і механізмамі з Савецкага Саюза. Трэць інжынерна-тэхнічных работнікаў завода прайшла падрыхтоўку ў вну і на прадпрыемствах Савецкага Саюза. Хіба могуць яны гэта забыць?! І тады, у ліпені 1960 года, пачуцці гарачай удзячнасці асвятлялі твары кітайскіх рабочых. А сустрэчы са студэнтамі геалагічнага факультэта Пекінскага універсітэта, з моладдзю цудоўнага студэнцкага горада Нанкіна! Сустрэчы з кітайскімі сябрамі сельскагаспадарчых чайных кааператываў недалёка ад горада Хангжоу... Іх нельга забыць! Гэта звенні супрацоўніцтва і дружбы савецкага і кітайскага народаў.

Зграя Мао Цзэ-дуна сілай, груба разарвала гэтыя сувязі і імкнецца адурманіць народ, распальваючы ідзе на крывавыя правакацыі.

Хочацца выказаць глыбокую надзею, народжаную тымі далёкімі сардэчнымі сустрэчамі, што кітайскі народ не дазволіць уцягнуць сябе ў крывавую авантуру, што яго здаровы розум пераможа.

Э. КЛЁСАВА,
дацэнт.

НАШЫ ГРАНІЦЫ — НЕДАТЫКАЛЬНЫЯ

Варожыя дзеянні кітайскіх улад супраць Савецкага Саюза ўспрымаюцца ўсім савецкім народам з глыбокай горыччу. Асабліва востра перажываюць людзі майго пакалення, на вачах якіх прайшла падрыхтоўка да Кітайскай рэвалюцыі і сама рэвалюцыя.

Яшчэ ў часы Леніна Савецкі Саюз адклікнуўся на просьбу вялікага кітайскага рэвалюцыянера Сун Ят-сена пасылкай у Кітай грамадзянскіх і ваенных саветнікаў. Добра вядома роля, якую адыгралі ў падрыхтоўцы Кітайскай рэвалюцыі нашы таварышы Барадзін, Блюхер і іншыя. Сама перамога Кітайскай рэвалюцыі стала магчымай дзякуючы ўсебаковай дапамозе Савецкага Саюза. Поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ў Кітаі таксама сталі магчымымі дзякуючы дапамозе нашага народа. Гэта дапамога была ў пастаўках прамысловага абсталявання і матэрыялаў, пасылцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, а таксама ў навучанні ў нас, у СССР, дзесяткаў тысяч маладых кітайскіх спецыялістаў. Частка іх і цяпер працуе ў Кітаі, а частка знішчана за сімпатыі да СССР.

Як жа магло адбыцца, што група Мао Цзэ-дуна забыла ўсё, што зрабіў для Кітая Савецкі Саюз, і выступае супраць нас з нечуванай жорсткасцю, якая магчыма раней была толькі пры панаванні кітайскіх мілітарыстаў. Справа ў тым, што так званая культурная рэвалюцыя, развязаная клікай Мао Цзэ-дуна звялася на справе да масавага праследавання і пакарання старых рэвалюцыйных і партыйных кадраў, якія знішчаюцца фізічна або маральна. Культ асобы Мао Цзэ-дуна прыняў нечуваныя памеры. Маладое пакаленне пачынаюць настройваць з самага ранняга ўзросту. Вось такія абалваненыя юнцы і дабівалі раненых савецкіх пагранічнікаў на востраве Даманскім.

У Кітая многа сваіх сапраўдных клопатаў па вяртанню кітайскіх зямель, захопленых у розныя часы імперыялістамі, каланізатарамі. У руках Чан Кай-шы, якога падтрымліваюць амерыканскія імперыялісты, знаходзіцца востраў Тайвань з дзесяцімільённым кітайскім насельніцтвам. Ля самага парога Кітая ляжыць англійская калонія Ганконг і партугальская — Макао — абедзве з чыста кітайскім насельніцтвам.

Аднак кліка Мао Цзэ-дуна накіроўвае ўсю вастрыню барацьбы супраць СССР, заяўляючы прэтэнзіі на нашы землі. Яна выкарыстоўвае канфлікт для раздування шавіністычных пачуццяў, для супрацьпастаўлення кітайскага народа народам Савецкага Саюза. Але мы верым, што прыйдзе час і кітайскі народ адновіць традыцыйныя сяброўскія адносіны з Савецкім Саюзам.

Ф. ГАХАЎ,
прафесар.

БАНДЫЦКІЯ ДЗЕЯННІ

На далёкіх рубяжах праліта кроў маіх равеснікаў, якія ахоўвалі мірную працу нашай Айчыны. Яны загінулі смерцю храбрых, але да канца выканалі свой воінскі абавязак, як выконвалі яго бацькі і старэйшыя браты. Ганьба Мао Цзэ-дуну і яго прыхільнікам, якія вядуць прыкрую шавіністычную прапаганду і пасылаюць на смерць моладзь сваёй краіны!

Граніцы СССР—свяшчэнныя. Іх абараняюць слаўныя хлопцы, якія пераняли ўсё найлепшае ад сваіх бацькоў і ўчарашніх воінаў. Падзеі ля нашых граніц яшчэ раз прадэманстравалі вернасць савецкіх воінаў свайму абавязку, адданасць Радзіме, партыі і народу, якія іх выхавалі.

А. ЗЛОТНІКАЎ,
студэнт другога курса гістфака.

Студэнты першага курса геолага-геаграфічнага факультэта пасябравалі з воінамі Беларускай ваеннай акругі. Нядаўна ў гасцях у студэнтаў пабывалі прадстаўнікі воінскай часці, а студэнты рыхтуюцца парадаваць воінаў шэфскімі канцэртамі.

На здымку: перад студэнтамі выступае лётчык Рыгор Фролавіч Петрык.

За вялікія заслугі ў развіцці савецкай навукі Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 13 сакавіка 1969 года прысвоіў званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і залатога медаля «Серп і Молат» вялікай групе савецкіх вучоных, у іх ліку — Яругіну Мікалаю Паўлавічу — акадэміку Акадэміі навук Беларускай ССР, прафесару нашага універсітэта.

НА ПЯРЭДНІМ КРАІ НАВУКІ

Навукова-педагагічную дзейнасць Мікалай Паўлавіч Яругін пачаў яшчэ ў студэнцкія гады, калі вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Ленінградскага універсітэта. У гэтым жа універсітэце ён праходзіў аспірантуру пад кіраўніцтвам акадэміка В. І. Смірнова, а потым плённа працаваў і дабіўся першых навуковых перамог. У 1937 годзе М. П. Яругін рашыў праблему Пуанкарэ і гэтую сваю работу абараніў у якасці кандыдацкай дысертацыі.

З 1939 года Мікалай Паўлавіч працуе старшым навуковым супрацоўнікам матэматычнага інстытута Акадэміі навук СССР і працягвае педагагічную работу ў Ленінградскім універсітэце.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны дацэнт М. П. Яругін добраахвотнікам пайшоў на фронт і з верасня 1941 па люты 1942 года змагаўся пад Ленінградам на пярэднім краі абароны. На фронце ён быў прыняты ў члены КПСС. М. П. Яругін мае некалькі ўрадавых узнагарод. Аб гэтым перыядзе ён яскрава расказаў ў сваёй кнізе «Аб тых, хто выстаяў».

У лютым 1942 года М. П. Яругін атрымаў цяжкае раненне і больш паўгода знаходзіўся ў шпіталі, а затым па стану здароўя быў дэмабілізаваны.

Яшчэ ў шпіталі Мікалай Паўлавіч вярнуўся да навуковай працы. Тут ён падрыхтаваў доктарскую дысертацыю, якую абараніў у 1943 годзе ў Саратаўскім універсітэце. У гэтым жа годзе яму было прысвоена званне прафесара.

З 1943 па 1957 год Мікалай Паўлавіч узначальвае кафедру дыферэнцыяльных ураўненняў Ленінградскага універсітэта, а з 1953 па 1957 год ён — намеснік дырэктара матэматычнага інстытута імя В. А. Сцяклова АН СССР па Ленінградскаму аддзяленню.

У 1951 годзе М. П. Яругіну за работы па якаснай тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў і тэорыі ўстойлівасці была прысуджана Дзяржаўная прэмія. У 1956 годзе Мікалай Паўлавіч выбіраецца акадэмікам АН БССР і неўзабаве пераязджае ў Мінск. Тут ён узначальвае кафедру дыферэнцыяльных ураўненняў у Беларускім дзяржаўным універсітэце і арганізуе лабараторыю дыферэнцыяльных ураўненняў у Інстытуце фізікі і матэматыкі АН БССР.

У 1959 годзе на базе матэматычных лабараторый Інстытута фізікі і матэматыкі быў створан Інстытут матэматыкі АН БССР, М. П. Яругін — дырэктар гэтага інстытута.

Вялікім прызнаннем навуковых заслуг Мікалая Паўлавіча з'яўляецца стварэнне ў Мінску ўсесаюзнага часопіса «Дыферэнцыяльныя ўраўненні», галоўным рэдактарам якога стаў М. П. Яругін. Гэты часопіс набыў шырокую папулярнасць як у СССР, так і за мяжой.

М. П. Яругіну належыць звыш 60 навуковых прац (з іх 4 манаграфіі), пад яго кіраўніцтвам абаронена больш 30 кандыдацкіх і 6 доктарскіх дысертацый.

Навуковыя інтарэсы акадэміка АН БССР М. П. Яругіна даволі разнастайныя: асноўны іх напрамак — тэорыя звычайных дыферэнцыяльных ураўненняў і даследаванні па аналітычнай і якаснай тэорыі лінейных і нелінейных сістэм, тэорыі ўстойлівасці і агульнай тэорыі.

Актыўная навукова-педагагічная і вялікая адміністрацыйная работа Мікалая Паўлавіча сведчыць аб яго невычэрпных творчых магчымасцях і вялікай энергіі.

Калектыў універсітэта горача віншуе выдатнага вучонага і педагога з высокай узнагародай і жадае яму новых творчых поспехаў на карысць савецкай навукі.

Л. ЦІТОВІЧ.

НА ПЕРАВАЛЕ

Здаецца, толькі ўчора мы пераступілі парог універсітэта, чутка прыслухоўваючыся да расказаў старшакурснікаў. Сёння ўжо самі маем вопыт: многа ці мала, а пяць навучальных семестраў засталіся ззаду. Залатая сярэдзіна! Праўда, для нас, трэцякурснікаў, яна аказалася не такой ужо і залатой. Мінулая экзаменацыйная сесія была самай цяжкай і, бадай, самай няўдачнай. Экзамены здавалі 61 чалавек. З іх 16 атрымалі «нездавальняюча». У выніку курс апынуўся ў ліку аутсайдэраў.

Цяпер, калі прыціхлі экзаменацыйныя хваляванні на курсавых сходах, на пасяджэннях камсамольскага бюро, пара падвесці вынікі пройдзенага.

Можа здацца недарэчным — зноў вынікі! У пратаколах жа сходаў чорным па беламу напісана: палепшыць паспяховасць, наведванне і дысцыпліну і г. д. Усё гэта так. Але, думаецца, не лішне будзе, калі кожны з нас падвядзе асабістыя вынікі.

Прыйшла пара задумацца над тым, што ж каштоўнага паклаў кожны з нас у свой багаж ведаў за гэтыя два з палавінай года? Ці на правільным шляху ён стаіць, ці не памыліўся ў выбары прафесіі?

Па-рознаму адказваюць на гэтае пытанне Я. Халява, І. Асінскі, О. Дубоўская і Т. Бондарва, А. Рыдкін, В. Міхневіч і іншыя студэнты нашага курса. Калі адны з іх сур'ёзна, удумліва рыхтуюцца да сесіі з першых дзён семестра, дык другія хапаюцца за падручнікі перад пачаткам экзаменаў, стараюцца штурмам асіліць тое, што было ўпушчана ў годзе. А гэта, як вядома, не заўсёды ўдаецца. І вельмі сумна бачыць такога «штурмавіка» пасля экзамена, калі ён, панура гледзячы пад ногі, бармоча: «Завал...»

Але гэта яшчэ не ўсё. Штурмаўшчына небяспечна тым, што слаба засвойваецца матэрыял. Здаў экзамен — і з плеч далоў! А там хоць трава не расці. Але праз месяц-другі ўсё забыта. Значыць, дарэмна чалавек час траціць.

Часам у нас гавораць: экзамен — гэта латарэя. Калі нават і так, то шанцуе ў ёй, як правіла, тым, хто сістэматычна накоплівае веды. Прыклад гэтаму — студэнт нашага курса Васіль Гурын. У яго заліковай кніжцы з першага па апошні семестр стаяць адны выдатныя адзнакі. Думаецца, ніхто не асмеліцца заявіць, што гэта справа выпадку, а не вынік штодзённай клапатлівай працы.

Зусім іншая справа ў С. Новікавай, М. Івашкевіч, Т. Бондаравай і іншых. Сінтэз лёгкадумства і абыякавых адносін да вучобы прывёў да таго, што яны атрымалі па некалькі нездавальняючых адзнак.

Гаворачы аб вялікай колькасці «хвастоў» на курсе, нельга абходна адзначыць дрэннае наведванне і дысцыпліну ў час лекцый. Гэта таксама дало сябе адчуць у агульным балансе паспяховасці.

У нашым асяроддзі бытуе такая думка: галоўнае, умець пісаць, а вучоба, наведванне—на другім плане. Вядома, чалавека, які не мае творчых здольнасцей, у сценах універсітэта пісаць не навучаць. Патрэбна схільнасць да гэтага. Але і яе мала. Касцёр затухае, калі ў яго не падкладваць дроў. Любы талент глохне, калі яго не падмацоўваць і не развіваць ведамі.

В. МАЛЯЎСКІ,
стараста І групы трэцяга курса журфака.

Факультэт журналістыкі стаў уладальнікам тэлевізійнай установы.

Скора студэнцкая студыя тэлебачання заявіць аб сваім нараджэнні.

Фота *А. Ласлінскага.*

ПАД АДНЫМ ДАХАМ

З ДЗЁННІКА АСПІРАНТА

Лёс, мабыць, не жартаваў, калі зводзіў нас у адным пакоі. Проста яму хацелася, каб людзі, якія ідуць у навуку, не былі адзін для другога цяжарам, а ўзбагачаліся прыгожымі думкамі, высокімі ідэаламі. Праўда, крыху пазней стала зусім зразумела, што лёс выступіў у выглядзе каменданта інтэрната і што ён зусім не дбаў пра наш інтэлект, а меў толькі адзін клопат — пасяліць! Вось і жывем цяпер мы, чацвёра аспірантаў з розных кафедр, пад адным дахам, з адным пастаянным клопатам — мала ў сутках часу.

На арганізацыйным сходзе (мы ўсе на першым курсе), успамінаецца, прафесар Л. В. Баладзько гаварыў ці то ў жарт ці сур'ёзна: «Не губляйце марна часу. Памятайце: тры гады — гэта не сем...»

Папярэджваў, відаць, нездарма. Я яшчэ ў арміі рыхтаваўся «адпачыць», адчуць асалоду аспіранцкага жыцця. На заняткі хадзіць не патрэбна. Ніякіх табе залікаў, семінараў. Карацей — хочаш вучыся, а хочаш — не. Але ж ці да гэтага тут! Мае таварышы зразумелі прафесара правільна. Няма яшчэ і сямі гадзін раніцы, а хлопцы ўжо на нагах, і наш невялічкі пакойчык умомант ператвараецца ў імправізаваную спортзалу. Мне даводзіцца асцерагацца, каб гантэля знянацку не заляцела ў ложак ці эспандэр не ляснуў каму-небудзь па вуху. Любяць хлопцы займацца спортам. Асабліва Гена Сардыка. Ён у нас літаратар. З выгляду нагадвае Фета, а жыццёвым шляхам — Мікалая Астроўскага. Такая, здавалася б, несумяшчальнасць даволі добра ўжываецца ў ім. Радзіўся недзе на Віцебшчыне, пасля школы быў шахцёрам у Карагандзе, вучыўся ў інстытуце, працаваў выкладчыкам педінстытута ў Ніжнім Тагіле. Гэта толькі некаторыя вехі яго жыцця, а так — дзе толькі не працаваў ён за свае трыццаць чатыры гады! Сваю справу вельмі любіць. Дамоў прыходзіць без чвэрці адзінаццаць гадзін вечара...

— Нешта, хлопцы, я бачу вас як у тумане.

— Пратры акуляры, — раім мы.

Апошні робіць гэта вельмі старанна, а пасля смяецца:

— Гэта я, мабыць, завучыўся, — і з жалем глядзіць на вялікія гантэлі. — Сёння зноў не выканаў распарадку дня. Цікавая навела Стэфана Цвейга папалася, — нібы апраўдваецца ён.

— Нічога, дзед, — гавораць Жэня Квасюк, — заўтра навярстаеш.

Гэта ўжо хімік. Ён самы малодшы ў нас і любіць пажартаваць. З кожным днём прыходзіць дамоў усё пазней і пазней. Пачаў неяк амаль святіцца ці блакітным, ці фіялетавым колерам. Але заўсёды з гонарам заяўляе:

— Сёння эксперымент рабіў. Галава баліць. Можа, атравіўся?..

Мы дзівіліся. Жартуе напэўна! А высветлілася — не. У яго ёсць свая лабараторыя. Сядзіць там з ранку да вечара, надыхаецца розных газаў і цягнецца дамоў з хворай галавой. Ніякае малако не дапамагае. А пасля не паспееш абмеркаваць здарэнні за дзень — ён ужо спіць, седзячы на ложку.

Кладземся спаць роўна ў 24 гадзіны. Недзе к гадзіне ночы скрыпяць нашы дзверы, і ў пакой прасоўваецца Валодзя Ладысеў — гісторык. Флегматычны і маўклівы да крайнасці. Дзе ён прападае так позна, высветлілася зусім нядаўна. Пасля работы ў бібліятэцы або ў архіве ён заходзіць да знаёмага згуляць партыю ў шахматы. Але, згуляўшы адну, як гэта бывае ў заядлых шахматыстаў, пачынаюць другую і трэцюю. Калі ж яму ўдаецца прыйсці дадому раней, ён бярэ шахматную дошку, фігуры і з задавальненнем ставіць мат... сам сабе.

Хлопцы жанатыя. Аб каханых размовы рэдкія. Толькі ў асаблівую хвіліну праб'ецца мужчынская пяшчота, паўздыхаюць хлопцы крыху, а пасля і заснуць моцным аспіранцкім сном. У аднаго жонка ў Оршы настаўнічае. Не вельмі далёка, але бачыцца даводзіцца рэдка. У другога — у Бабруйску. Нядаўна нарадзіла Андрэйку. Прыйшлося маладому бацьку тэрмінова схуднець, шукаючы соску, каляску, ванначку. Можа мне здалося, але лоб у яго стаў гармонікам.

У мяне турбот як бы менш. Увесь час праводжу адзін эксперымент — скарачэнне сну. Раней спаў, як усе людзі, сем-восем гадзін, пасля — цвёрда сем і прыступіў да пераходу на шасцігадзінную ноч, па сістэме аднаго прафесара, які даваў парады ў «Неделе». Што атрымаецца, не ведаю. Але цяпер, калі сон стаў асабліва чуйным і нервовым (у чаканні званка будзільніка), я добра планую свой наступны дзень. Калі мне не патрэбна ісці на пасяджэнне камітэта камсамола, на сход факультэцкага актыву, на рэпетыцыю, на дзяжурства дружыны, тады я адпачываю ў бібліятэцы.

Хлопцы вельмі шмат працуюць. Ужо даўно вызначаны тэмы работ. Яны знаёмяцца з неабходнай літаратурай, пішуць філасофскія рэфераты, рыхтуюцца да кандыдацкіх экзаменаў. Іх энергія і напорыстасць грунтуюцца на вялікім захапленні любімай справай, жаданні як мага глыбей пранікнуць у цікавейшы свет навукі, таму часовы смутак не кранае іх вялікага аптымізму. Я зайздрошчу іх поспехам і радуюся, што яны канкрэтна ўсвядомілі сваё становішча, зразумелі абавязак і працуюць, як рабочы ля свайго станка, не трацячы марна ні адной хвіліны.

С. АЛЕГАЎ.

СПРАВА АГУЛЬНАНАРОДНАЯ

Праводзячы ленінскую палітыку міру, КПСС і Савецкі ўрад не могуць не ўлічваць існуючую небяспеку ваеннага нападу на нашу краіну. Таму, апрача ўсемагчымага ўмацавання нашых Узброеных Сіл, вялікая ўвага ўдзяляецца арганізацыі грамадзянскай абароны, актыўнай падрыхтоўцы насельніцтва і народнай гаспадаркі да аховы ад зброі масавага знішчэння — ядзернай, хімічнай і бактэрыялагічнай.

Грамадзянская абарона — гэта сістэма агульнадзяржаўных абаронных мерапрыемстваў, якія здзяйсняюцца ў мірны і ваенны час.

Каб паспяхова справіцца з задачай аховы савецкіх людзей і аб'ектаў народнай гаспадаркі на выпадак вайны, неабходна загадзя, у мірны час, навучаць насельніцтва мерам і спосабам аховы ад зброі масавага знішчэння, азнаёміць яго з характарам і аб'ёмам выратавальных і аварыйна-аднаўленчых работ на месцах паражэння. Навучанне спосабам аховы — адна з важнейшых задач грамадзянскай абароны.

Падрыхтоўка студэнтаў па грамадзянскай абароне вядзецца па спецыяльнай праграме ў аб'ёме 50 гадзін у час вучобы. Супрацоўнікі і аспіранты універсітэта праходзяць навучанне на кафедрах, у лабараторыях і аддзелах па праграмах штаба грамадзянскай абароны СССР.

У 1969 годзе супрацоўнікі і аспіранты будуць удасканальваць веды па 21-гадзіннай праграме. Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на прывіццё практычных навыкаў у карыстанні індывідуальнымі і калектыўнымі сродкамі аховы, уменне дзейнічаць пры пагрозе нападу праціўніка і па сігналу «Паветраная трывога», а таксама аказваць першую медыцынскую дапамогу.

У працэсе навучання неабходна дабіцца, каб кожны супрацоўнік і аспірант засвоіў наступныя практычныя дзеянні:

— умела падабраць размер маскі процівагаза, хутка і правільна надзяваць яго;

— карыстацца падручнымі і рыхтаваць прасцейшыя сродкі аховы;

— ведаць свае абавязкі і ўпэўнена дзейнічаць пры пагрозе нападу праціўніка, пры правядзенні эвакуацыі і па сігналу «Паветраная трывога»;

— аказваць першую медыцынскую дапамогу пры розных разбурэннях у ядзерным, хімічным і бактэрыялагічным месцах паражэння;

— умела карыстацца сховішчамі і ўкрыццямі прасцейшага тыпу.

Паспяховае выкананне вучэбных задач залежыць ад своечасовага і правільнага вырашэння арганізацыйных пытанняў: стварэння вучэбных груп, падбору кіраўнікоў заняткаў і іх падрыхтоўкі, выбару найбольш зручнага для заняткаў часу, які б забяспечыў максімальнае наведванне. Адказнасць за арганізацыю навучання ўскладзена на кіраўнікоў факультэтаў, кафедр, лабараторый і аддзелаў. Прафсаюзныя, камсамольскія і абаронныя арганізацыі абавязаны ўсямерна дапамагаць адміністрацыі ў выкананні гэтага важнага мерапрыемства. Універсітэт мае неабходную вучэбна-матэрыяльную базу, і кіраўнікі заняткаў павінны яе выкарыстоўваць.

Сур'ёзныя адносіны да заняткаў па грамадзянскай абароне—абавязак кожнага супрацоўніка і аспіранта універсітэта.

В. КАСАЧОЎ,
начальнік грамадзянскай абароны універсітэта.

У ДРУЖБЕ З МАСТАЦТВАМ

ПАЧЭСНА І АДКАЗНА

Самадзейных артыстаў нашага універсітэта ведаюць у Кіеве і Адэсе, Вільнюсе і Ленінградзе, у Казані і іншых гарадах. А дома, ва універсітэце, без іх не абыходзіцца ніводнае свята. Яны прымалі самы актыўны ўдзел у правядзенні вечароў, прысвечаных 50-годдзю камсамола, юбілею рэспублікі і Камуністычнай партыі Беларусі, прапагандавалі класічнае мастацтва, творы савецкіх майстроў на фабрыках, заводах, у воінскіх часцях, выступалі перад калгаснікамі.

А летам агітбрыгады далі канцэрты ў лагеры мовы ў Закапане для польскіх і ў Іене для нямецкіх студэнтаў.

Тры ганаровыя медалі і граматы заваявалі нашы калектывы мастацкай самадзейнасці ў час свята песні ў Вільнюсе. За ўдзел у рэспубліканскім аглядзе, прысвечаным 50-годдзю БССР і Кампартыі рэспублікі, народны аркестр народных інструментаў удастоены дыплома першай ступені, а яго кіраўнік і дырыжор М. А. Лісіцын і асобныя выканаўцы ўзнагароджаны граматамі. Гэты ж калектыў стаў уладальнікам яшчэ адной ганаровай узнагароды — пераходнага прыза імя народнага артыста СССР Жыновіча.

Дыплом першай ступені і званне «народны» заваяваў танцавальны калектыў (мастацкі кіраўнік і пастаноўшчык Н. В. Лапша). Студэнцкі тэатр, якім кіруе заслужаны артыст ЛатССР А. М. Озераў, удастоен дыплома II ступені.

У першым паўгоддзі многа навічкоў-першакурснікаў фізічнага, хімічнага і матэматычнага факультэтаў прыйшло ў народную харавую капелу (кіраўнік В. І. Раговіч).

Цяпер у агульнаўніверсітэцкіх калектывах мастацкай самадзейнасці займаецца больш 350 студэнтаў. Накіроўвае іх работу мастацкі савет. Да асобных калектываў замацаваны камуністы.

Значна выросла матэрыяльная база: рыхтуюцца новыя касцюмы для артыстаў аркестра народных інструментаў, набыты музычныя інструменты.

Цяпер усе калектывы працуюць над новымі праграмамі да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна. П'есу аб Зоі Касмадзям'янскай «Праўда аб казцы» М. Алігер ставіць студэнцкі тэатр. У красавіку пройдзе першы этап агляду факультэцкай мастацкай самадзейнасці пад дэвізам «Мастацтва — народу», прадугледжаны выезды мастацкіх калектываў у Кіеў і ГДР.

Дружба нашых студэнтаў з мастацтвам усё мацнее, пашыраюцца сувязі студэнцкіх калектываў, расце майстэрства аматараў музыкі, песні, танца.

С. ЛЫСЕНКА,
дацэнт філфака,
член парткома.

ДЗЕНЬ ДОБРЫ, КАЛІНІНГРАД!

Напярэдадні 8 сакавіка гаманлівы натоўп юнакоў і дзяўчат з вялікімі чамаданамі, з балалайкамі, домрамі, цымбаламі і іншымі музычнымі інструментамі накіроўваўся ў бок вакзала. Гэта студэнты БДУ імя У. І. Леніна, удзельнікі аркестра народных інструментаў, танцавальнага і драматычнага калектываў, улюбёныя ў народныя песні, танцы, музыку, ехалі ў госці да студэнтаў Калінінградскага універсітэта. Настрой быў узняты і бадзёры. Нават надакучлівы, жорсткі снег не мог ні на хвіліну засмуціць яго.

— Напэўна, артысты на гастролі едуць, — пачулі мы размову дзвюх жанчын.

— Бачыце, нас лічаць сапраўднымі артыстамі, — з затоеным гонарам сказала адна з дэбютантак.

Нарэшце, цягнік на перон. Часу зусім мала, а патрэбна ж пагрузіць інструменты.

Але вось пасадачная мітусня засталася за намі, на Мінскім вакзале.

Вагон загудзеў, як узбуджаны вулей. На верхніх полках занялі свае месцы цымбалы, баяны, балалайкі, і толькі нашы гастралёры не маглі ўрымсціцца. Гучалі песні, чуўся смех, гоман. А праз паўгадзіны музыка, песні сталі поўнымі гаспадарамі ва ўсіх вагонах, дзе ехалі студэнты. Начная цемразь даўно ахутала зямлю, але гэта менш за ўсё турбавала няўрымслівых пасажыраў. Усю ноч нельга было заснуць ад трапных жартаў, дружнай песні і нават... танцаў! Так, так, не забыліся тут пра лявоніху, цыганачку і вясёлую летку-енку. Калі ж сабраліся, нарэшце, падрамаць, — удалечыні ўжо засвяціліся агні Калінінграда. Куды дзяваліся стомленасць і санлівасць! Юнакоў і дзяўчат нібы падмянілі. Бадзёра загаманілі, захацелася хутчэй выйсці на вуліцу, наб дыхнуць свежым паветрам, паглядзець на незнаёмы горад. На вакзале ўжо чакалі нашы сябры — студэнты Калінінградскага дзяржаўнага універсітэта, старшыня студкома, прарэктар т. Ахапкін, былы выпускнік нашага універсітэта. Яны дапамаглі нам пагрузіць рэчы ў аўтобус, а потым павялі на трамвайны прыпынак. Горад яшчэ спаў. І яго ранішнюю цішыню парушалі толькі нашы галасы.

У інтэрнаце універсітэта нам, вядома, не хапіла двух пакояў з акуратна расстаўленымі раскладушкамі, але аператы ўнасці гаспадароў можна было пазайздросціць. Амаль праз хвілін дваццаць нехта ўжо соладка спаў, нехта імчаўся ў сталоўку, ну, а самыя мужныя, узяўшы фотаапараты, ужо арганізоўвалі экскурсію па гораду. У Калінінградзе ёсць што паглядзець. Тут захавалася шмат гістарычных будынкаў і помнікаў. Кафедральны сабор, магіла нямецкага філосафа Канта і інш. Цікавая гісторыя магілы Канта: у час вайны фашысты раскапалі яе, памералі чэрап. Пераканаўшыся, што Кант арыец, — зноў закапалі. Калі ж прыйшлі ў горад нашы войскі, то на наступны дзень з'явіўся жартаўлівы надпіс: «Ну, што, пераканаліся, што свет матэрыяльны!».



Дарагой была кожная хвіліна, бо хутка ж рэпетыцыя. І ўсё ж на рэпетыцыю прыйшлі крыху раней, захацелася паглядзець на Палац рыбакоў. Яго адразу можна пазнаць, бо перад самым уваходам вас сустракае магутная фігура рыбака з сеткаю. Палац строгіх форм, без лішніх упрыгожанняў. З густам аформлены ўсе яго памяшканні, у некаторых стаяць вялізныя акварыумы з залатымі рыбкамі, на другім паверсе прыцягвае ўвагу выстаўка дзіцячых малюнкаў. Дзеці рыбакоў у асноўным малююць мора, караблі, смелых маракоў. Але здзіўляцца не прыходзіцца, бо гэтыя маленькія мастакі з дзяцінства прывязаны да мора.

Рэпетыцыя крыху зацягнулася, і калі мы выйшлі з залы, то ў вестыбюлі ўбачылі многа людзей. Прызнацца, крыху разгубіліся.

Пакуль ішло ўрачыстае пасяджэнне, мы хадзілі па усіх пакоях, усё разглядалі, а час, здаецца, як ніколі, ішоў марудна. Нарэшце канцэрт пачаўся. Першымі выступаюць танцоры. Мы хвалюемся за іх, часта наведваемся за кулісы, а то і ў зал, хоць туды не лёгка папасці, так многа гледачоў. Але ўсё ідзе выдатна, яны выступаюць на «вышэйшым узроўні», і доказ гэтаму апладысменты, якія доўга не змаўкаюць пасля ножнага танца. Вельмі спадабалася калінінградскім гледачам і выступленне нашага тэатра мініятур. Асабліва бразна раскрываецца характар беларускага народа.

Разам з аркестрам выступалі і салісты. Надзвычай спадабалася гледачам выканаўца лірычных песень, салістка аркестра Ларыса Чапурка, якая зачаравала іх сваім моцным, прыгожым голасам і задушэўнасцю. Цёпла сустрэлі і другога саліста аркестра — Яўгенія Сафонава. Двойчы гучала ў яго выкананні песня Новікава «Расія». Ды і наогул калінінградцы аказаліся вельмі гасціннымі, чулымі гледачамі. За кожнае выступленне яны плацілі шчырымі апладысментамі, якія ўзнімалі наш настрой. Мабыць таму так добра выканаў аркестр п'есу Аляб'ева «Салавей» і таленавіта, з натхненнем саліраваў баяніст Барыс Іваноў.

Канцэрт прайшоў надзвычай удала: мы былі задаволены цёплым прыёмам, гасціннасцю гаспадароў, а яны нашай праграмай. Так прайшоў першы дзень гастролей, перапоўнены ўражаннямі аб горадзе, аб яго жыхарах.

Назаўтра мы паабяцалі даць яшчэ два дадатковыя канцэрты: нас вельмі шчыра запрашалі да сябе воіны. І хоць нам вельмі хацелася паглядзець Балтыйскае мора, бліжэй пазнаёміцца з горадам, мы ўсё ж вырашылі прынесці радасць тым, хто гэтага заслугоўвае. А мора... Мы вырашылі, што паглядзім на яго ў наступны раз. І нікольк не шкадавалі, бо бачылі, як нам рады, як узнімае настрой мастацтва.

Салдаты — самыя шчырыя, самыя ўражлівыя гледачы, таму мы з задавальненнем выступалі перад імі. Першы вялікі канцэрт далі воінам-маракам. Зал невялікі, а гледачоў занадта многа; месца дзе стаць і то не хапала. Доўга не змаўкалі авацыі пасля кожнага нумара, а некаторыя прыйшлося выканаць некалькі разоў. Танцорам прыйшлося паўтарыць «Лядкоўскую кадрыль», а салістам аркестра выконваць і «запасныя» песні. А пасля канцэрта — знаёмствы. І вядома ж, да нас падышлі землякі: М. Арэшка з Баранавіч, А. Харланаў з Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці і інш. Распытвалі пра Беларусь, пра надвор'е, навіны, усё было ім цікава. Вядома, крыху засумавалі хлопцы па дому. А нам цікава было ў сваю чаргу пазнаёміцца з традыцыямі воінаў, з іх жыццём. Вельмі спадабаўся нам музей

баявой славы. Пра музеі ў воінскіх часцях мы і раней чулі, але бачыць прыйшлося ўпершыню. У ім сабран багаты і змястоўны матэрыял. Цікава вёў экскурсію па музею Іван Прановіч.

На развітанне нас пакармілі сытным салдацкім абедам, напаілі моцным хлебным квасам. Упарадзе яшчэ адзін канцэрт.

У прасторнай актавай зале ўжо даўно нас чакалі. І зноў, як і на іншых канцэртах, са сцэны доўгі час не хацелі адпускаць салістаў народнага аркестра народных інструментаў Яўгенія Сафонава і Ларысу Чапурка.

Пасля канцэрта гаспадары вынеслі падзяку за добры канцэрт і ўручылі калектыву універсітэцкай самадзейнасці Граматы за высокае майстэрства выканання. А потым запрасілі ўсіх удзельнікаў самадзейнасці наведаць музей баявой славы. Гэты музей, яго цікавыя традыцыі заслугоўваюць самай высокай ацэнкі.

У гэтым музеі кожную вясну, у дзень нараджэння У. І. Леніна, прымаюць у піянеры школьнікаў; тут яны клянуцца быць чэснымі, праўдзівымі, адданымі запаветам Леніна. Тут ручаюць камсамольцам чырвоную кніжачку — камсамольскі білет.

Хутка, вельмі хутка закончыліся нашы сустрэчы з гасціннымі калінінградцамі, своеасаблівым горадам. Пара і развітвацца. Падарожжа заканчваецца. На памяць прыходзяць словы з Граматы, якую ўручылі нам воіны за добры канцэрт: «Мы ўпэўнены, што і далей гэтыя сувязі, якія сталі добрай і жаданай традыцыяй, будуць расці і мацнець».

Т. ЦЕРАХ,
Л. ВАНЧУКЕВІЧ,
удзельнікі мастацкай самадзейнасці.

НА ЗДЫМКАХ: «рэпетыцыя» ў вагоне поезда (уверсе злева); знаёмства з экспанатамі музея баявой славы (справа); універсітэцкія артысты на калінінградскіх сцэнах (у цэнтры); беларуская музыка паланіла сяброў (здымак унізе).

Фота *М. Нечыпарэнкі.*

У КАМІТЭЦЕ КАМСАМОЛА

ТРЭЦІ СЕМЕСТР КЛІЧА

Камітэт камсамола універсітэта разгарнуў падрыхтоўку да трэцяга працоўнага семестра. Створан штаб працоўных спраў, адказнымі ў ім за беларускія будоўлі зацверджаны студэнты А. Якубаў, Я. Жыгайла, Г. Арол, А. Каракоў.

Узначаліць секцыю гарадскіх будоўляў даручана студэнту другога курса матэматычнага факультэта С. Храпуноўскаму.

Адказны за будоўлі БДУ і за мяжой — студэнт юрыдычнага факультэта У. Панько. Сакратаром штаба працоўных спраў зацверджан А. Елісеенка.

Зацверджана і секцыя цаліны. Галоўны інжынер — студэнт БПІ Я. Чарнабрывец, інжынер па забеспячэнню камісара цалінnага штаба Л. Жуковіч. Функцыі ба ўскладзены на У. Арсенюка.

На пасяджэнні зацверджаны таксама секцыя прапаганды і агітацыі, прэс-група.

На адным з апошніх пасяджэнняў бюро камітэта камсамола БДУ зацвярджаліся кандыдатуры камандзіраў і камісараў цалінных студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Трэці працоўны семестр 1969 года, які ў гонар ленінскага юбілею аб'яўлен ударным, абяцае быць гарачым. І таму не выпадкова, што на пасаду кіраўнікоў выбіраліся людзі з належным працоўным вопытам і добрымі арганізатарскімі здольнасцямі.

Каля 300 студэнтаў БДУ, якія сёлета будуць працаваць на цалінных будоўлях, аб'ядноўваюцца ў атрады.

Камандзірамі двух будаўнічых атрадаў, якія фарміруюцца на фізічным факультэце, зацверджаны В. Емяльяненка і М. Алтушэў, камісарамі — Ю. Макараў і І. Жулнярэвіч. Не адсталі ад фізікаў і матэматыкі: яны таксама рыхтуюць два атрады, кіраўнікамі якіх з'яўляюцца А. Каракоў, У. Лахаданаў, Ю. Сатскоў і Л. Вараб'ёў. На юрфаку камандзірам атрада зацверджан М. Міхайлаў, камісарам — З. Жгун. Будзе створаны студэнцкі атрад і на хімічным факультэце.

Вельмі малыя зрухі ў філолагаў і журналістаў. Яны павінны сфарміраваць адзін зводны атрад, але справы пакуль што ў іх не наладжваюцца.

Справядлівы папрок на пасяджэнні бюро быў зроблен і ў адрас гісторыкаў: вельмі марудна ідзе падрыхтоўка да трэцяга працоўнага семестра. А ў мінулыя ж тры гады гісторыкі паказвалі прыклад іншым факультэтам...

Да падвядзення вынікаў першага этапу спаборніцтва штабаў і студэнцкіх будаўнічых атрадаў у падрыхтоўчы перыяд засталіся лічаныя дні.

Днямі ў Ганалесе паблізу Мінскага мора адбылося першынство універсітэта па лыжах. У першы дзень спаборніцтваў на 15 кіламетраў мужчыны, на 5—жанчыны, а таксама праходзіла эстафета адпаведна 4×10 і 3×5.

Па выніках спаборніцтва факультэты размеркаваліся наступным чынам: геолага-геаграфічны, матэматычны, хімічны, журналістыкі, філалагічны, біялагічны, фізічны, гістарычны, на апошнім месцы юрыдычны.

На здымках: (злева) старт эстафеты; (справа) заработай судзейская калегія.

Фота **А. Ласмінскага.**

ЛЫЖЫ — СПОРТ РАМАНТЫКАЎ

Днём лекцыі, семінарскія, гадзіны ў лабараторыях. А потым лыжная база. На хвіліну затрымліваемся ў раздзявалках і ўжо з лыжамі на электрычцы ці ў аўтобусах — за горад. Там, дзе ўладарыць прырода, і пачынаюцца нашы трэніроўкі.

Пракладзена лыжня...

Сёння ў праграме тэхніка хадзьбы на лыжах. Трэнер Людміла Аляксееўна Капылова яшчэ і яшчэ раз выпраўляе памылкі рабят.

— Мацней адштурхоўвайся, за рукамі сачы!

Праз пагадзіны Саня Струновіч ужо беспамылкова ідзе па лыжні.

Трэніроўкі строгія. Нагрузкі рэгулярныя — сістэматычна з дня ў дзень. Рэжым! Бадай, з гэтага і пачынаецца сапраўдны майстар. Мінае час, і з «вялага» першакурсніка атрымліваецца выдатны першаразраднік.

Лыжы — спорт раманты каў! І найлепшая пара года для іх — зіма. Вось калі можна па-сапраўднаму размахнуцца. А ў час зімовых канікул хлопцы і дзяўчаты пакідаюць інтэрнаты і едуць на зборы куды-небудзь за Мінскае мора на спартыўныя і турысцкія базы. Тут ужо самы сапраўдны рэжым. Ёсць і пад'ём і адбой. І трэніроўкі кожны дзень, а для біятланістаў і па дзве ў дзень. Носішся да сёмага поту, «набіраешся» тэхнікі. Вольны час і адпачынак праходзяць тут па-свойму — толькі на лыжах і туды, дзе яшчэ не былі. (Здымак 1).

У кожнай працы — свой вынік. У нас — гэта спаборніцтвы. Спаборніцтвы на першынство горада, рэспублікі, унутрывузаўскія, універсітэцкія.

Ёсць і свой кумір — Франц Шалькевіч (здымак 2) — трохразовы чэмпіён універсітэта, высокі, жыццярадасны хлапец з чацвёртага курса геафака. 15 кіламетраў прайшоў за 55 мінут 10 секунд, «дзесятку» — за 40 мінут.

Факультэт, дзе вучыцца Франц, таксама чэмпіён. За ім першае месца ў лыжных спаборніцтвах паміж факультэтамі.

Да лыжнікаў непасрэдна прымыкаюць і біятланісты. Дакладней, такія ж лыжнікі, толькі адрозніваюцца яны тым, што возяць добраахвотна на сваіх спінах васьмікілаграмовыя вінтоўкі і страляюць з іх праз кожныя пяць кіламетраў. І праз кожныя пяць кіламетраў ім прыходзіцца падаць у снег, а потым правяраць мішэні. (Здымак 3).

У спаборніцтвах на першынство Беларусі паміж вну наш студэнт Валодзя Сыцько з другога курса матэматычнага факультэта, заняў трэцяе месца. Гэта найлепшы вынік ва універсітэцкай зборнай.

Спаборніцтвы закончаны, а трэніроўкі працягваюцца. Рамантыка добра ўжываецца з удаскональваннем майстэрства.

Б. ЯБЛОНСКІ,
член зборнай універсітэта па біятлону.



Владимир ДОЛИНИН

МОИ ТОВАРИЩИ ШАГАЮТ...

Тачанки мчались Тереком в горах
И низвергались взрывом огнепады,
Летели мы в будённовских годах
И босиком ходили на парады...
Из ничего вставали
Магнитка... Днепрогэс,
И молотом гремели пятилетки,
На худеньких плечах прогресс
Тащили в завтра наши однолетки.
А в сорок первом, сразу повзрослев,
Среди смертей и пламени пожарищ
Глотали пули, песни не долев,
Писали кровью гордое «товарищ».
Плечом к плечу вставали имена
И трепетали флагом над рейхстагом,
И рушилась зловещая стена
Истории необратимым шагом.
Отгромыхав, закончились бои,
Сменили гимнастёрки на спецовку,
В атаке дел ровесники мои
Кайло сжимают, как вчера винтовку.
Шумело время, чудеса творя,
Сдавался атом, покорялись звёзды,
И впереди, как факелы, горя,
Мои товарищи шагают — комсомольцы.

Валерий КРУГЛИК

НАКАЗ ДЕДА

Как страшной нечисти волна
Несла нам море бед,
Как начиналася война,
Повествовал мне дед.
Как много наций налетело
Стаей в четырнадцать ворон,
Чтобы рвать страны живое тело,
Чтобы спасти Романов трон.
Рассказывал не для потехи
Историю мне дед,
Как на Урале бились чехи,
Чтоб погасить «Авроры» свет.
И я спросил: Скажи, дедусь,
Ты ранен был тогда?
А он ответил: Внучек, Русь —
Вся ранена была.
Помолчал, покашлял сухо,
Говоря: Проклятый чех.
Почесал затылок, ухо
И сказал: Я не о тех,
Что дрались в интербригаде...
Кашлянул опять и снова:
Был однажды сильный бой,
Не случись тогда такого,
Не было б меня с тобой...
С чехом я сидел в засаде,
Смерть ко мне летела сзади,
И он закрыл меня собой.
Когда ж ты рану получил?—
Я повторил вопрос.
— Когда от свастики лечил
Европу древний росс...
Девятого то было мая,
Всё на пути своём сметая,
Спешили в Прагу мы тогда,
Там и подбили нас на Влтаве
Пушкой, сработанной в Остраве.
Там и закончил я войну...
Потом ещё я видел Злату Прагу,
И плакал, слушая присягу
Из детских уст на маленькой могиле,
Где похоронен русский—наш солдат...
В конце сказал мне дед:
За братство стой, мой внук, горой
И помни—чья б рука нам ни вредила,
Как ни грозила вражья сила,
Союз наш вечен — кровь его скрепила!

ПРЫЗЁРЫ ВЫЗНАЧАНЫ

13—15 сакавіка праходзіла асабіста-камандная першынство універсітэта па класічнай барацьбе па праграме спартакіяды. У спаборніцтвах, якія праводзіліся па абноўленых правілах, удзельнічала звыш 70 чалавек. Да апошняга дня спаборніцтваў прадстаўнікі каманд не ведалі, як жа размяркуюцца прызавыя месцы, таму ўсе ўдзельнікі змагаліся з вялікім стараннем, каб вывесці сваю каманду у прызавую тройку. У выніку трохдзённай упартай барацьбы камандныя месцы размеркаваліся наступным чынам: 1 — фізфак (15 ачкоў), II—мясцком (16), III—хімфак (17). Далей ідуць гістфак, матфак і юрфак. У асабістым заліку першае месца ў парадку вагавых катэгорый занялі В. Шчыбрыкаў—мясцком, О. Пытлеў—фізфак, І. Якаўлеў — фізфак, А. Гіра — гістфак, В. Кабыркін — фізфак, М. Круглікаў — хімфак, В. Лятун — мясцком, В. Ліпень — хімфак, В. Камароў — мясцком.

В. ФЕФЕЛАЎ,
галоўны суддзя спаборніцтваў, суддзя рэспубліканскай катэгорыі.

Калектыў універсітэта глыбока смуткуе з выпадку раптоўнай смерці Героя Сацыялістычнай Працы, члена-карэспандэнта АН СССР, акадэміка АН БССР, доктара біялагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча навукі БССР, прэзідэнта Акадэміі навук БССР Васіля Феафілавіча КУПРЭВІЧА і выказвае глыбокае спачуванне сям'і і блізкім памёршага.

Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.